ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення
па адукацыі
Магілёўскага аблвыканкама
_____________ А.Б.Заблоцкі
"_7_" кастрычніка 2024 г.

# ЗАДАННІ
## для правядзення рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА З ЭЛЕМЕНТАМІ ВОДГУКУ

Дата правядзення: 19 кастрычніка 2024 г.
Час выканання заданняў: 10.00 – 14.00.

**IX клас**

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **8** | **6** | **6** | **12** | **12** | **12** | **10** | **6** | **8** | **20** | **100** |

**Заданне 1.** Запішыце па-беларуску наступныя "кулінарныя" словы і словазлучэнні.

*Максімальная колькасць балаў – 8.*

| **"Кулінарныя" словы і словазлучэнні** | **Пераклад на беларускую мову** |
|---|---|
| завтрак из двух блюд | |
| сливочное масло | |
| подсолнечное масло | |
| жарить тыквенные семечки | |
| ломтик сала | |
| ароматная говядина | |
| кувшин для кваса | |
| вкусный ужин | |

**Заданне 2.** Раздзяліце наступныя словы на марфемы, размясціўшы іх у асобных ячэйках табліцы. Памятайце пра існаванне нулявога канчатка, у патрэбнай графе пазначайце "нулявы".

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Слова** | **Прыстаўка** | **Корань** | **Суфікс(ы)** | **Канчатак** | **Постфікс** |
|---|---|---|---|---|---|
| **Узор:** перацягванне | *пера-* | *-цяг-* | *-ва- -нн-* | *-е* | - |
| безнадзейны | | | | | |
| пераезд | | | | | |
| утрымацца | | | | | |
| уніз | | | | | |
| нечаканы | | | | | |
| нагледзецца | | | | | |

**Заданне 3.** Адзначце (падкрэсліце) правільную фанетычную транскрыпцыю наступных слоў. Націскны галосны выдзелены тоўстым шрыфтам.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Слова | Варыянты фанетычнай транскрыпцыі |
|---|---|
| разведчык | [развʼэччык] [разʼвʼэдчык] [разʼвʼэччык] |
| падʼязджаць | [падʼйазджацʼ] [падйазджацʼ] [падйажджацʼ] |
| схільнасць | [сʼхʼілʼнасʼцʼ] [схілʼнасʼцʼ] [сʼхʼілʼнасцʼ] |
| збегчы | [сбʼэхчы] [зʼбʼэхчы] [збʼэгчы] |
| барацьба | [барадзʼба] [барацʼба] [барадʼба] |
| усміхаешся | [усʼмʼіхайэсʼсʼа] [усмʼіхайэсʼсʼа] [усмʼіхайэшсʼа] |

**Заданне 4.** Пастаўце прыведзеныя дзеясловы ў форму 2-й асобы множнага ліку абвеснага і загаднага ладу.

*Максімальная колькасць балаў – 12.*

| Дзеяслоў у інфінітыве | Форма 2-й асобы множнага ліку абвеснага ладу | Форма 2-й асобы множнага ліку загаднага ладу |
|---|---|---|
| глянуць | | |
| прынесці | | |
| піць | | |
| ткаць | | |
| выбегчы | | |
| разгледзець | | |

**Заданне 5.** Замяніце наступныя фразеалагізмы адным словам і ўкажыце, з якой часцінай мовы суадносіцца кожны з іх.

*Максімальная колькасць балаў – 12.*

| Фразеалагізм | Слова, якое тлумачыць значэнне фразеалагізма | Часціна мовы, з якой суадносіцца фразеалагізм |
|---|---|---|
| абое рабое | | |
| за дзедам шведам | | |
| павесіць нос | | |
| даць драпака | | |
| грушы на вярбе | | |
| гады ў рады | | |

**Заданне 6.** Пастаўце націскі ў наступных словах.

*Максімальная колькасць балаў – 12.*

Спіна, чатырнаццаць, выпадак, камбайнер, вусы, крамяны, шэсцьдзясят, дачыста, квартал, адзінаццаць, каменны, трапеза.

**Заданне 7.** Перакладзіце наступны тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

Огромный старый клён, возвышавшийся над всей южной частью сада, видный отовсюду, стал ещё больше. Он оделся свежей густой зеленью. На чистом зелёном дворе от надвигающейся отовсюду растительности стало как будто теснее, дом стал как будто меньше и красивее (Паводле Івана Буніна).

**Заданне 8.** Як вядома, існуе некалькі родаў мастацкай літаратуры. Размяркуйце наступныя творы па калонках табліцы ў адпаведнасці з прыналежнасцю іх да пэўнага роду.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Аляксей Дудараў "Вечар", Пятрусь Броўка "Пахне чабор", Аркадзь Куляшоў "Маці", Янка Купала "Паўлінка", Віктар Карамазаў "Дзяльба кабанчыка", Васіль Быкаў "Жураўліны крык".

| **Эпас** | **Лірыка** | **Драма** | **Ліра-эпас** |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |

**Заданне 9**. Запішыце ў табліцу агульнавядомыя псеўданімы наступных беларускіх пісьменнікаў, чые творы вы вывучалі на ўроках беларускай літаратуры. Укажыце, каму з гэтых пісьменнікаў належаць наступныя творы: паэма "Магіла льва", байка "Дыпламаваны Баран", паэма "Сымон-музыка", верш "Шчасце".

*Максімальная колькасць балаў – 8*

| **№** | **Сапраўднае імя пісьменніка** | **Псеўданім** | **Твор** |
|---|---|---|---|
| 1 | Кандрат Кандратавіч Атраховіч | | |
| 2 | Іван Дамінікавіч Луцэвіч | | |
| 3 | Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч | | |
| 4 | Яўген Іванавіч Скурко | | |

**Заданне 10**. Напішыце міні-водгук (да 15 сказаў, 3 абзацы) на наступны паэтычны твор.

**Вузел**

Не ведаю, якім вузлом
Навекі я прывязан
Да старых сосен за сялом,
Да яблынь, груш і вязаў,
Да кладак гладкіх,
Валуноў,
Да траў, жытоў на ўзлесках,
Да партызанскіх курганоў
І помнікаў гвардзейскіх...
Адно я знаю: гэткі меч
На свеце не скуецца,
Каб мог ён вузел мой рассеч,
Не закрануўшы сэрца.

*Аляксей Пысін*, 1958 год*

***Даведка**. Аляксей Пысін (1920-1981) – пісьменнік-франтавік з Магілёўшчыны.*

*Максімальная колькасць балаў – 20.*